# КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 53 (1283) 31 снежня 2016 г.


## 500 гадоў беларускага кнігадрукавання

# 2017



**Гравюра з выдадзенай Францыскам Скарынам у Празе "Трэцяй кнігі Царстваў" (1518 год).** / Алічбоўка ажыццёўлена Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі

# З Новым годам і Нараджэннем Хрыстовым!

# Беларускі народны каляндар-2017

**Народны каляндар — гэта сістэма сталых ці рухомых святаў, прысвяткаў, абрадаў, гульняў, звычаяў, што замацаваны ў побыце і фальклоры. Уяўляе з сябе пераважна спалучэнне язычніцкай і хрысціянскай культуры. Гэта — фальклорны каляндар: ён складзены на аснове хранонімаў, якія зафіксаваны ў вуснай народнай творчасці беларусаў, і ўключае традыцыйныя арыенціры на сельскагаспадарчыя работы і адпачынкі ў гадавым, сезонным, месячным і іншых цыклах-рытмах.**

**Сістэматызаваны беларускі народны каляндар у складзе з велікодна-валачобнымі песнямі, якія ў строгай храналагічнай паслядоўнасці апісваюць традыцыйныя прысвяткі і святы, у тым ліку тыя, што закансерваваліся ў непараўнальных паэтычных узорах як Навагоддзі / Навалецці, з'яўляецца нашым шэдэўрам і фенаменальнай з'явай сусветнай нематэрыяльнай культуры.**

***У народным календары на 2017 год прадстаўлены асноўныя святы і прысвяткі з кароткімі тлумачэннямі, прыкметамі, урыўкамі з валачобных песень і гэтак далей. Дні (хранонімы), якія адзначаюць беларусы-каталікі, вылучаны курсівам. У праваслаўных яны замацаваны за старым, юльянскім, календаром. Зорачкай /*/ пазначаны святы "рухомай" царкоўнай пасхаліі.***

*У 2018 годзе па праваслаўнай пасхаліі Вялікдзень (Пасха) 8 красавіка, па каталіцкай — 1 красавіка.*

*Умоўныя абазначэнні: п — панядзелак, а — аўторак, с — серада, ч — чацвер, пт — пятніца, сб — субота, н — нядзеля. Даўжыня дня і моманты ўсходу і заходу ў дні сонцастаянняў і раўнадзенстваў падаюцца для Мінска. Больш падрабязна пра значэнне хранонімаў календара можна прачытаць у нашых кнігах "Беларускі народны каляндар" (Мінск, 1993, 2002).*


Падчас конкурсу народных танцаў "Мяцеліца" ў Мінску. / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ


Падчас Купалля на "Берагіні" ў Акцябрскім. / Фота Алены ЛЯШКЕВІЧ


Народны майстар Беларусі Мар'ян Скрамблевіч і яго інструменты. / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

## СТУДЗЕНЬ

**1. н. Новы год.** Вялікае Княства Літоўскае перайшло на студзеньскі стыль у 1550 годзе, Расія — з 1700 года. "А хто ўпярод? Новы ж год".

**6. пт. Першая, Посная куцця**. Перадкалядная вячэра. Які дзень, такі і год. ***Тры Каралі.*** Каталікі праводзілі маскіраваны абрад "Тры каралі", або "Гэроды".

**7. сб. Раство Хрыстова.** Пачатак **Каляд.** "Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі…" Калядавалі. Насілі "звязду". Паказвалі батлейку. На Каляды праводзілі ігрышчы ("вадзілі казу", "жанілі Цярэшку", "пяклі ката", гулялі ў "Яшчура" і іншыя).

**9. п. Сцяпан.** "На святога Сцяпана вышэй слуга за пана".

**13. пт. Шчодрая куцця.** Пачатак **Шчодрага тыдня.** "Мароз, хадзі куццю есці".

**14. сб. Васілле. Новы год** па праваслаўным календары. "Сею, сею, пасяваю, з Новым годам вас вітаю".

**18. с. Трэцяя, Галодная, Вадапосная куцця.** Апошнія дні Каляд. "Каляда ад'язджае".

**19. ч. Вадохрышча (Хрышчэнне).** "Святое Кшчэнне ваду ксціла […], свет ачысціла і ваду наверх пусціла", "На Вадохрышча завіруха — на Вялікдзень таксама".

**20. пт. Прывадохрышча** — заканчэнне Каляд. Пачатак **Малой вясельніцы** (да посту).

**24. а. *Аксіння.*** "Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце". **Фядос.** "На Фядоса цёпла".

**25. с. Таццяна.** Свята студэнтаў. ***Павел.***

**31. а. Апанас, Гусінае свята.** Свята свойскай жывёлы. "Хавай нос у апанасаўскі мароз".

## ЛЮТЫ

**1. с. *Ігнат.*** "На святога Ігната зіма багата".

**2. ч. *Грамніцы, Стрэчанне.*** "Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы", "Грамніца — хлебу палавіца…"

**5. н. *Агата.*** Каровіна свята. "Хлеб і соль святой Агаты не пусціць бяды да хаты".

**6. п. Паўзіміца Аксіння.** "На Аксіні мяце". ***Дарота.*** "Па Дароце высахнуць хусты на плоце".

**11. сб. Ігнат.** "Ігнат Грамніцам рад".

**12. н. *Памінальніца.** Памінальны тыдзень. Калі "вея" ў нядзелю, то авёс трэба сеяць на 9-м тыдні, калі ў панядзелак — то на 8-м, калі ў сераду ці чацвер — то пакідалі "дзесяцінкі дзве".

**14. а. Трыфан.** "На Трыфана зорна — вясна позняя". ***Валянцін.*** Свята закаханых.

**15. с. Грамніцы, Стрэчанне.** "Зіма з летам сустракалася...", "На Грамніцы палавіна зіміцы".

**18. сб. Агата.** Каровіна свята.

**19. н. *Рабы тыдзень, Малая вясельніца, Развітальны, Сырапусны тыдзень.** Тыдзень перад Масленіцай. Які добры дзень на Масленым тыдні, у той дзень ад Ільы сеялі лён. Дзяўчаты вешалі "калодкі" нежанатым хлопцам.

**22. с. *Лысая серада.** Праталіны-залысіны.

**23. ч. *Блакітны чацвер.** Тумановы дзень. ***Крывы, Тлусты чацвер, Валосы, Валосся.** Свята жывёлы. "На Валосага бліны пяклі ці аладкі, каб былі валы гладкі".

**24. пт. *Дзедава пятніца. Улассе.** Свята жывёлы. "Аўлас на сыры лас". ***Мацей.*** "На Мацея дарога пацее", "На Мацея адліга — будзе мароз".

**25. сб. *Масленыя Дзяды (Бабы).** "Дзяды не зналі бяды, а нашы ўнукі зазналі мукі".

**26. н.** *Маладзік у 17.58 (коладападобнае сонечнае зацменне).* ***Масленіца.** "Масленіца ў "вятху" (пасля поўні) — дзяржы пшаніцу ў мяху, сей пшаніцу на ўсю руку". ***Гуканне вясны.** "Блаславі, Божа, зіму замыкаці, вясну загукаці". На Палессі вадзілі карагоды, "спявалі чырачку", насілі ёлку з вянком. **Фаціння.** Заступніца ад хвароб.

**27. п. *Паласказуб.** Першы дзень Вялікага посту. Паласкалі зубы гарэлкаю.

## САКАВІК

**1. с.** ****Серада Папяльцовая*** (пач. Вялікага посту ў каталікаў). ***Уступная серада.** Каб урадзіў лён, мылі верацёны ці калаўроты, хадзілі ў карчму і пераскоквалі цераз пень.

**4. сб. *Зборава субота.** Абрад "споведзі дзежкі". ***Казімір.*** "Святы Казімір дровы сячэ".

**5. н.** ***Зборніца, Ізбор.** Адзін з варыянтаў Новага года / лета ў час прыняцця юльянскага летазлічэння. "Святы Ізбор упярод ступіць". Пачатак збору ў поле.

**9. ч. Янка, Паўраценне.** Мядзведзь паварочваецца ў бярлозе на другі бок.

**12. н. *Рыгор.*** "На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора".

**13. п. Васіль Капяльнік.** Са стрэх капае.

**14. а. Аўдоцця Вясноўка. Гуканне вясны.** "На Аўдокі голы бокі". (1.03 Новы год у мінулым, сакавіцкі каляндарны стыль). "Святы Еўдакей […] пераступ года".

**15. с. Хвядот.** "На Хвядота занос — усё сена знясе".

**17. пт. Герасім Гракоўнік.** "Герасім гракоў прыгнаў".

**19. н. *Язэп.*** "Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту". "На Язэпа пагода — год ураджайны".

**20. п.** *Пачатак **Храстовага тыдня.** Пяклі "храсты". Засеўкі. Абрад "жаніцьбы коміна". *Вясновае раўнадзенства. Усход — 7.17, захад — 19.17.*

**22. с.** ***Серадапосце.** Выпякалі "храстцы". **Саракі.** Было Новым годам / летам. "Святыя Саракі наперад пайшлі". Свята птушак. Прылятае 40 выраяў. "Святыя Саракі ў поле саху валаклі". **Прыска**. "На святога Прыску праб'е лёд і пліска".

**25. сб. Рыгор.** "На Рыгора зіма ідзе ў мора". ***Дабравешчанне, Звеставанне.*** "І птушка гнязда не кладзе". Прылёт бусла. Гуканне вясны. Было Новым годам. "Перша свята — нова летца, Благавешчан зямлю сушыць".

**26. н. Міжблагавешчыны** (да 7 красавіка). Забарона на "запасванне" кароў.

**27. п.** Пачатак ***Пахвальнага тыдня.** "Дзікая качка яйцом пахваліцца". ***Арына.*** "На Арыну сей капусту ў расадніках".

**30. ч. Аляксей Цёплы.** Дзень рыбалова. "На Цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бортнік на хвою".

**31. пт. *Пахвальная пятніца.** Мыццё дзежак. **Палікарп.** Пачатак бясхлебіцы.

## КРАСАВІК

**1. сб. *Пахвальная (Мезіна) субота.** Не грымелі кроснамі, каб гром не грымеў. **Дар'я Вясенняя.** Адбельвалі палотны.

**3. п.** Пачатак ***Вербнага тыдня.**

**6. ч. Камаедзіца.** Свята мядзведзя. **Благавеснік.** Пяклі пірагі "буславы лапы".

**7. пт. Благавешчанне.** "Благавешчанне без ластавак — халоднае лета". Абрад "Страла".

**8. сб. Благуста.** "На Благусту сей капусту".

**9. н.** * ***Пальмова нядзеля.*** "Вярба б'е, не я б'ю". ***Вербніца. Матрона.** "На Матрону шчупак хвастом лёд разбівае".

**10. п.** Пачатак ***Белага, Вялікага, тыдня. *Чысты панядзелак.** Бялілі і мылі ў хаце.

**11. а. *Чысты аўторак.** Каб на людзей і "гаўядо" не напала "параша", трэба ўсё мыць.

**12. с.** ***Дравяная страсць.** Мыюць усё драўлянае.

**13. ч.** ***Чысты чацвер.** Лазня. Абрад мыцця дзежкі.

**14. пт.** ***Чырвоная, Велікодная, пятніца.** Сеялі гарох. **Прабуджэнне хатніка.** У гэты дзень хлусілі, каб заблытаць хатніка. **Мар'я.** Калі ў ясную ноч прыбывала вада, то суха будзе ў жніво на хлебнай ніве.

**15. сб. *Вялікая, Чырвоная, субота.** Фарбавалі яйкі. Канец Вялікага посту.

**16. н. *Вялікдзень** (у праваслаўных і каталікаў). "Хрыстос уваскрос! — Сапраўды ўваскрос!" Быў Новым годам. "Першае свята — свята Вялікадня".

**Мікіта.** "Калі на Мікіту крыгаход, то няма ні клёву, ні лову рыбаловам".

**17. п.** Працяг ***Велікоднага тыдня.** "Першы дзень пірагі маюць, а сярэдні пагуляюць, а паследні дзень выпраўляюць".

**19. с. *Градавая серада**. **Праводны, Мёртвы, тыдзень.** "Пайшла зіма да Кіева, а лета нам пакінула".

**20. ч. *Людавы дзень.** Раней у Віленскай губерні білі і качалі яйкі з лубкоў, гушкаліся на арэлях. ***Вялікадне мёртвых (Наўскі Вялікдзень, Мёртвы Вялікдзень, Наўскі чацвер).** Дзень памінання на могілках. Хлопцы і дзяўчаты абліваліся вадою.

**21. пт. *Прашчэнне.** Абліваліся вадою. **Руф.** Руф рушыць снягі.

**23. н. *Праводная нядзеля.** "Ідзі, зіма, да Кучава, як ты нам надакучыла". ***Юры.*** (Новы год па задыяку). "Першае святца — святы Юр'я", "Як зязюля закукуе за 12 дзён да Юр'я на "голы" лес, то не чакай ураджаю і будзе хварэць жывёла". ***Войцах.*** "Святы Вайцеху выпусціў жаўранка з меху".

**24. пн. *Радаўнічныя Дзяды. Анціп —** ахоўнік зубоў.

**25. а.** ***Радаўніца.** "На Радаўніцу да абеду пашуць, па абеду плачуць, а к вечару скачуць". ***Марк.*** "Дождж на Марка, дык зямля як шкварка".

**28. пт. Пуд.** "Пуд снег пугне".

**29. сб. Арына.** "На Арыну сей капусту".

**30. н. Зосім —** ахоўнік пчол. **Андрыянава ноч, Андрэй.** Ноч дзявочай варажбы і чараўніцтва.

## МАЙ

**1. п. Кузьма.** "Май Кузьма з морквінай сустракае, а Пахом з гурком".

**5. пт. Ляльнік.** Свята Лялі — дачкі Лады.

**6. сб. Юр'е.** Свята жывёлы. "Як дождж на Юр'я — хлеб будзе і ў дурня". Абрад "Страла".

**7. н. *Міраносцы.** "На Міраносця п'яныі бабы цігаюць адна адну за валосся". **Алісей.** "Прыйшоў Алісей — авёс пасей". **Бабскія розбрыкі.** Скокі жанчын і качанне па зямлі дзеля ўрадлівасці.

**8. п.** Пачатак ***Пераплаўнага, Чарвівага, тыдня.** Не трэба садзіць, бо заядуць чэрві. **Марк.** "Дождж на святога Марка — дык зямля, як шкварка". ***Станіслаў.*** "Сей лён на Станіслава — вырасце як лава".

**10. с. *Градавая, Пераплаўная, серада.** Засцярогі ад граду і дажджу.

**Ярылавіца.** Свята Ярылы.

**13. сб. Якуб.** "На Якуба грэе люба".

**14. н. Макарэй.** Абрады ля вады.

**15. п. Барыс**. Апякун поля і жывёлы.

**18. ч. Арына Расадніца.** Дзень высаджвання расады ў Паазер'і.

**19. пт. *Градабойцы, Ледавіты дзень** (Віленская губ.).

**20. сб. Антоній.** "На святы Антоній сей авёс для коней, а як удасца дык і прадасца".

**21. н. Іван Веснавы**. Апякун земляроба. "На Івана каласок, а на Пятра піражок".

**22. п. Мікола Веснавы.** Свята пастухоў. ***Алёна.*** "Сей лён на Алену, будзе кашуля па калена".

**23. а. Зілот.** "Сей пшаніцу на Зілота, і яна будзе як злата".

**24. с. Макей.** "Мокра на Макея — і лета не прасушыць". **Кірыла і Мяфод.** "Калі дзень мокры — і лета будзе мокра".

**25. ч.** ****Ушэсце.*** Унебаўшэсце пана Езуса. Свята агляду жыта. ***Ушэсце.** Абрад "Страла". **Епіфан.** "На Епіфана раніца ў чырвоным каптане, неба з барваю — гарачае лета".

**27. сб. Сідары.** "Прыйшлі Сідары — прыйшлі і сіверы".

**28. н. Пахом.** "Святы Пахом павее цяплом". "Сей агуркі на Пахом — будзеш насіць мяхом".

**29. п. *Магдалена.*** Зязюльку прысылае.

**31. с.** ***Градавая серада. Шэсць дзеў.** "Лён сей позні". **Канапелька Матруна.** "У зямлю махнула". **Фядот.** "Як на дубе апушка — у Фядота поўна аўса кадушка".

## ЧЭРВЕНЬ

**2. пт.** ***Сёмушныя Дзяды. Тры пакутнікі.** "Няма лета, але пасля іх не бывае зімы".

**3. сб. *Духавая субота, Зялёная субота. Алёна, Ульяна.** Дзень ільну.

**4. н.** ****Сёмуха, Зыход Святога Духа.*** Свята зелені. "На Духа будзе цёпла і суха". ***Сёмуха, Тройца.** Культ продкаў і расліннасці. "Павядзём Куста пад гай зялёненькі..." **Васіліск.** "Ад Васіліска і салавей блізка".

**5. п. *Русальніца, Іван ды Мар'я.** Праводзіны вясны. "На Граннай нядзелі Русалкі сядзелі..." **Дзень Ефрасінні Полацкай.** Хадзілі ў Полацк пакланіцца і абрацца.

**6. а. *Конскі Вялікдзень.** Свята коней.

**7. с. *Градабой, Серада Русаль.** Здабывалі з ясеня святы агонь. **Ян.** "Рой перад Янам — пчаляр будзе панам".

**8. ч. *Наўская Тройца, Абліваха.** Памінанне.

**13. а. Ерамей. *Антоній.*** "Антоні, аддай коні".

**14. с. Юстын і Харытон.** "Юстын цягне ўверх каноплі, а Харытон — лён".

**15. ч.** ****Божае цела, Зелянок.*** ***Дзявятнік.** Перавод уніятаў у праваслаўе. "Дзеўяць ягодзін на ветцы".

**16. пт.** ***Дзевятуха.** Дзень ад навальніцы. **Лук'ян.** Паўднёвы вецер на Лук'яна — на добры ўраджай яравых.

**18. н.** ***Русальчыны розыгры.** Засцерагаліся рос. ***Пятроўскія запускі.** Развівалі вянкі.

**19. п. *Пятроўка (Петравіца)** Пятроўскі пост да 11 ліпеня. Пятроўка-галадоўка.

**21. с.** *Летняе сонцастаянне* (з 20 да 22 чэрвеня). *Даўжыня дня — 16.50. Усход — 4.46, захад — 21.36.* **Тодар.** "На Тодара раса — канапель паласа".

**22. ч.** ***Дзясятнік.** "Дзясятнік гнаі возіць". **Кірыла.** Пачыналі касавіцу ў Паазер'і.

**23. пт.** ***Дзясятка.** "Косы точыць", "Жыта паспявае". ***Купала.*** У старажытнасці — Новы год / лета.

**24. сб. *Ян Купальны*.** "Сонца грае".

**25. н. Анапрэй.** "Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ".

**26. п. Акуліна Грачышніца.** Сеялі грэчку. **Задзярыхвост.**

**28. с. Амос.** "Прыйшоў Амос — цягне ўгору авёс".

**29. ч. Ціхан.** "Пеўчыя птушкі заціхаюць". ***Пятрок.*** "Да Пятра зязюльцы кукаваці", "Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйдзе Ілья — ападуць і два".

## ЛІПЕНЬ

**6. ч. Купалле**. Свята Сонца і кахання. "Дзень адбаўленне, ночы прыбаўленне".

**7. пт. Іван Купала.** "Учора была Купала, а сёння Іван".

**10. п. Самсон.** "На Самсона дождж — сем тыдняў то ж". ***Сем братоў.*** "Сем братоў варожаць, колькі тыдняў пагоды".

**12. с. Пятро.** Свята заканчэння Купалля.

**13. ч. Паўпятро.** Дзень талакі. **Сымон і Юда.** "На Сымана й Юды конь баіцца груды".

**14. пт. Кузьма і Дзям'ян.** Свята кавалёў. "Святы Пятро жыта спеліць, святы Кузьма сярпы робіць, а святы Дзям'ян сена грабе".

**17. п. Андрэй.** "Авёс у світцы, а на грэчцы і кашулі няма". "Андрэй усіх мудрэй".

**18. а. Свята Месяца.** "Месяц гуляе".

**21. пт. Казанская. Пракоп**. "Пракоп бок прыпёк". ***Данат.*** "Святы Данат коскі точыць".

**25. а. Прокл.** Засцерагаліся вялікіх рос. ***Якуб.*** "На Якуба хлеба поўна губа".

**26. с. Гаўрылей.** Засцеражэнне ад граду. ***Ганна.*** Снапы кладзе.

**29. сб. Афінаген.** Заціхаюць птушкі.

**31. п. Серпавіца, Шыпілінка** (пятніца перад Ільёю). Дзень "зазубравання" сярпоў.

## ЖНІВЕНЬ

**1. а. Макрыны.** "Глядзі восень па Макрыні".

**2. с. Ілья.** Свята дажджоў і навальніц. "Ілья нарабіў гнілля", "Укінуў у ваду кусок ільда".

**4. пт. Мар'я.** "Магдалена — вады па калена".

**6. н. Барыс Палікоп.** "Барыс і Глеб — паспеў хлеб".

**7. п. Ганны.** "Святы Ганны бабкі стаўляюць".

**9. с. Палікоп.** Паліць копы. **Панцеляймон.** Сцаляў ад хвароб галавы.

**11. пт. *Лаўрын.*** "На Лаўрына спяшай да млына".

**12. сб. Сіла.** Жыта сей.

**14. п. Макавей, Першы Спас.** Свята маку і мёду. **Спасаўка.** Пост да 28 жніўня.

**15. а. Базыль.** "Базыль авечкам воўну дае". ***Прачыстая, Зельная.*** "Прыйшла Прачыста — стала поле чыста".

**16. с. Антоны Віхравеі. Рох.** "Кірмаш на паненак".

**17. ч. Еўдакія.** Агуркі збірае.

**19. сб. Яблычны Спас.** Свята садавіны.

**23. с. Лаўрэн** — свята млынара.

**24. ч. *Баўтрамей*.** "Св. Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей". "Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей".

**27. н. Міхей.** Выспяваюць брусніцы.

**28. п. Прачыстая.** Свята ўраджаю.

**29. а. Трэці Спас.** Свята хлеба. **Ян.** "Ян на лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў".

**30. с. Міроны Ветрагоны.** "Пыл па дарозе гоняць, па прыгожым леце стогнуць".

**31. ч. Флор і Лаўр.** Свята коней. **Арабінавыя дзень і ноч.** "Сухая" навальніца, дождж.

## ВЕРАСЕНЬ

**5. а. Лупа.** "Сей на Лупа — будзе жыта купа".

**7. ч. Баўтрамей.** "Жыта на зіму сей".

**8. пт. *Другая Прачыстая.*** "Меншая Прачыста — канчай сеяць начыста".

**10. н. Мацей**. Абаронца ад п'янства.

**11. п. Калінавік, Іван Крываўнік.**

**13. с. Кіпрыян.** Журавель збіраецца ў вырай.

**14. ч. Сымон.** Абрад "жаніцьбы коміна". (Асенняе Навалецце / Навагоддзе з 1493 года). Закрыванне зямлі. **Бабіна лета. *Узвіжанне.***

**19. а. Цуды, Міхал.** "Міхал з поля спіхаў".

**21. ч. Багач, Нараджэнне Божае Маці.** Свята заканчэння ўборкі зерневых. Засідкі.

**22. пт.** *Асенняе раўнадзенства. Усход — 7.01, захад — 19.02.*

**24. н. Тадора.** "На Тадору ўсякае лета заканчваецца".

**26. а. Стаўроўскія Дзяды.**

**27. с. Звіжанне.** Свята закрывання зямлі на зіму. Гадзюкі — у кучу.

**29. пт. *Міхал.*** "Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то не май на надвор'е надзеі". **Сіцыян.** "Святы Сацыян ды ляны пасцілаў".

## КАСТРЫЧНІК

**2. п. Зосім.** Журавіны на Зосіма ўздымаюцца — мароз на Пакровы ўдарыць.

**3. а. Астап, Астаф'я.** Прыкметы па ветры.

**4. с. *Пранцішак, Францішак.*** "На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка".

**8. н. Сяргей. Жалезны тыдзень.**

**9. п. Іван Шаптун, Іван Кураед, Багаслоў.** Шапталіся сваты пра нявест.

**14. сб. Пакровы, Трэцяя Прачыстая.** Вясельная пара. "Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку — вяночкам". "Пакровы — зарыкалі каровы". **Дзявоцкае лета** (па 21.10). Прымалі "ў дзеўкі" сяброўак.

**21. сб. Трыфан, Палагея.** "Золкім ветрам вее". ***Зміцер.*** "Да Змітра баба хітра".

**25. с. Марцін** — свята млынароў.

**28. сб. *Сымон і Юда.*** "Сымон з Юдаю працу ў полі канчаюць, хаты аглядаюць". ***Параскева Пятніцкая.*** Забарона на прадзенне.

**29. н. Лонгін.** Збавіцель ад хвароб вачэй.

**30. п. Паклоны.** Дзень адбівання паклонаў.

**31. а. Лука.** "Хто сее да Лукі, не будзе мець ні хлеба, ні мукі". Дзень іканапісцаў. ***Юльян —*** ахоўнік дзяцей.

## ЛІСТАПАД

**1. с. *Усе святыя.*** Памінальны дзень.

**2. ч. *Задушны дзень.*** Памінальны дзень.

**4. сб. Казанская.** Дождж ці снег. **Асяніны, Змітраўскія Дзяды.** "Святыя дзяды, завём вас..."

**8. а. Зміцер.** "Да Змітра дзеўка хітра". Канец надзеі выйсці замуж у гэтым годзе.

**9. с. *Тодар.*** "На Тадора поўна камора".

**10. ч. Параскі.** Апякунка жанчын і рукадзелля.

**11. пт. Настуся.** Настуся стрыжэ авечкі. ***Марцін.*** "Мядзведзь кладзецца ў бярлогу".

**12. сб. Артошка.** Пачатак прадзення.

**14. п. Кузьма-Дзям'ян.** Апякун земляробства, кавалёў і вяселля.

**21. а. Міхайлаў дзень.** Абаронца ад грому. Мядзведзі ідуць у спячку.

**22. с. Матрона.** "З Матроны становіцца зіма".

**24. пт. Хвёдар Студзянец.** "Хвёдаравы вятры галоднымі ваўкамі скуголяць".

**25. сб. Іван Міласцівы.** Дзень падарункаў. ***Кацярыны.*** "Кацярына забрала лета".

**27. п. Юстыніян.** Апякун пладнасці і дзяцінства. **Піліп.** Пярэдадзень Піліпоўскага посту (да 7 студзеня).

**28. а. Піліпаўка** — перадкалядны пост.

**29. с. Мацей.** "На Мацея зіма пацее".

**30. ч. *Андрэй*.** Дзявочае свята.

## СНЕЖАНЬ

**3. н. *Адвент.*** Перадкалядны пост.

**4. п. Увядзенне.** Водзяцца ваўкі. ***Барбара.*** "Барбара ноч урвала, а дзень надтачыла".

**5. а. Пракоп. *Савы.*** "Барбара мосціць, Сава цвікі войстрыць, а Мікола прыбівае".

**6. с. Матрыхваны.** Не пралі. ***Мікола.*** "Хвалі зіму па Міколе".

**7. ч. Кацярыны.** "Забрала край лета".

**9. сб. Юр'е Зімовы.** Юра мосціць. ***Ганны.*** "Ад Ганны да Каляд два тыдні і два дні".

**13. с. Андросы, Андрэйкі.** Варажылі.

**14. ч. Навум.** Наставіць на вум.

**17. н. Варвары**. "Мікола і Варвара ноч урвалі".

**18. п. Савы, Міколін бацька.** "Сава мосце, а Мікола гвоздзе".

**19. а. Мікола Зімовы.** "Без Міколы не бывае ні зіма, ні лета". "Мікола марозам гвоздзіць".

**22. пт.** *Зімовае сонцастаянне. Усход — 9.33, захад — 16.43. Даўжыня дня — 7.10 .*

**Ганны.** "Ганны — прыбавіцца багата дня", "Ганкі — палічаны дзянькі".

**24. н. *Посная куцця.*** Пачатак Каляд (да 6 студз.).

**25. п. Спірыдон Сонцаварот. *Божае Нараджэнне.*** Было Новым годам. "Свята Ражаство ўпярод пашло, новы гадок павёў радок".

**26. а. *Сцяпан.*** "Кожны сабе пан".

**31. н. Марк.** "Марка да В-арка — няхай будзе парка". ***Багатая куцця. Сільвестр.*** Варажылі дзяўчаты.

**Алесь ЛОЗКА, фалькларыст**

Газета КУЛЬТУРА ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Галоўны рэдактар** — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ільля СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
**Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.** Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 3 910. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 29.12.2016 у 16.00. Замова 4843. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Увага! Аб'ява!*

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Інстытут культуры Беларусі"**
**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады дацэнта**
(1 штатная адзінка) кафедры культуралогіі
і псіхолага-педагагічных дысцыплін.
**Тэрмін падачы заяў на конкурс — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**
**Даведка па тэл.: 369-78-99**

# 500 гадоў беларускага кнігадрукавання




Гравюра з выдадзенай Францыскам Скарынам у Празе "Кнігі Прамудрасці Божай" (1518 год).
/ Алічбоўка ажыццёўлена Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі

## СТУДЗЕНЬ

| ПН | АЎТ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

## ЛЮТЫ

| ПН | АЎТ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | | | | | |

## САКАВІК

| ПН | АЎТ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

# 2017



КУЛЬТУРА
www.kimpress.by

## 500 гадоў беларускага кнігадрукавання




**Гравюра з выдадзенай Францыскам Скарынам у Празе "Кнігі Эклезіяста" (1518 год).** / Алічбоўка ажыццёўлена Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі

### КРАСАВІК

| ПН | АЎТ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |

### МАЙ

| ПН | АЎТ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

### ЧЭРВЕНЬ

| ПН | АЎТ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | |

# 2017

КУЛЬТУРА
www.kimpress.by



500

# 500 гадоў беларускага кнігадрукавання



Гравюра з выдадзенай Францыскам Скарынам у Празе "Другой Кнігі Царстваў" (1518 год).
/ Алічбоўка ажыццёўлена Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі

## ЛІПЕНЬ

| ПН | АЎТ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

## ЖНІВЕНЬ

| ПН | АЎТ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

## ВЕРАСЕНЬ

| ПН | АЎТ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | |

# 500 гадоў беларускага кнігадрукавання



Гравюра з выдадзенай Францыскам Скарынам у Празе "Трэцяй кнігі Царстваў" (1518 год). / Алічбоўка ажыццёўлена Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі

## КАСТРЫЧНІК

| ПН | АЎТ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

## ЛІСТАПАД

| ПН | АЎТ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

## СНЕЖАНЬ

| ПН | АЎТ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

## МУЗЕІ

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.*

Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".

Выставы:
■ Выстава твораў рускага жывапісу XIX—XX стст. са збору Аляксандра Валадчынскага — да 6 лютага 2017-га.
■ Выстава **"Свет нябесны на зямлі"** — да 30 студзеня 2017-га.
■ Выстава **"Майстры Віленскай школы Міхась Сеўрук і Пётра Сергіевіч. Жывапіс і графіка з прыватных калекцый"** — да 23 студзеня 2017-га.
■ Выстава твораў Юрыя Карачуна (1931–1997), прысвечаная 85-годдзю з дня нараджэння мастака — да 23 студзеня 2017-га.
■ Выстава **"Калядная казка"**, прысвечаная святу Раства Хрыстова — да 10 студзеня 2017-га.
■ Цыкл лекцый **"Музейныя гісторыі"** — да 11 студзеня 2017-га (кожную сераду а 19-й, Малая зала).

*Філіялы музея*

### МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-Й ПАЛОВЫ XIX ст."
*г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.*

Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
■ Выстава чароўных лялек мастака Настассі Адамовіч **"Краіна цудаў"** — да 23 студзеня 2017-га.

### МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
*Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Дзіцячая навагодняя праграма **"На Каляды ў музей!"** — 14 студзеня 2017-га.
■ Кожную суботу ў 12.00 — майстар-класы па стварэнні лялек-мотанак, ткацтве паясоў, саломкапляценні і роспісе яек.

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 226 09 22.*

Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры XIX — XX стст.".

Выставы:
■ Выставачны праект **"Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля"** — да 1 чэрвеня 2017-га.
■ Выстава **"Час цудаў. Зімовыя святы і забавы"** — да 28 лютага 2017-га.
■ Выставачны праект **"Час нямых зорак. Ад чорна-белага да чырвонага"** — да 15 студзеня 2017-га.
■ Выстава фотаздымкаў Вадзіма Качана **"Стары Мінск"** — у галерэі музея.
■ Выстава работ вучняў студыі "Калякі-малякі" **"Зімовая вясёлка"** — да 20 студзеня 2017-га.
■ Акцыя **"Вольнае піяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.

*Філіялы музея*

### ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
*г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.*
■ **Абноўленая экспазіцыя**, прымеркаваная да 100–годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі.
■ Выстава **"Музей ёлачных цацак"** — да 31 студзеня 2017-га.

### МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
*г. Мінск, вул. К.Маркса, 38. Тэл.: 327 46 12.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

### МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.*

Экспазіцыі:
■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ "Выстава насякомаедных раслін".

*г. Мінск, вул. Багдановіча, 9а. Тэл.: 237 46 94.*
■ Выстава **"Шумлівая пярнатая вясёлка"** — да 13 сакавіка 2017-га.

*г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.*
■ Выстава **"Сафары парк"**.

### МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
*г. Мінск, Музычны зав., 5. Тэл.: 220 26 67.*

Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст."
■ Выстава **"Стары куфар і прыгажуня ёлка"** з калекцыі Наталлі Кавалёвай — да 15 студзеня 2017-га.

### ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
*г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.*
■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:
■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.
■ Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.
■ Выстава **"Запаветныя жаданні"** ў рамках праекта "Спадарыня лялька" — да 15 студзеня 2017-га.

### МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
*г. Мінск, вул. Свярдлова, 4. Тэл.: 327 10 75.*

Пастаянная экспазіцыя.
■ Навагодняя рэтраспектыва **"Неверагодныя прыгоды"** (добрыя фільмы для ўсёй сям'і Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм") — да 5 лютага 2017-га.

### БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
*г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8. Тэл: 327 11 66; 203 07 92.*
*Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"На мой кліч вечавы…"**, прысвечаная жыццю і творчасці Янкі Купалы ў перадваенны час і ў першыя гады Вялікай Айчыннай вайны, — да 2 студзеня 2017-га.

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
*г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; + 37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.*

*Палацавы ансамбль*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Спадчына Святой Еўфрасінні Полацкай"** — да 15 студзеня 2017-га.
■ Выстава **"Апладысменты скрозь стагоддзі"** — да 15 студзеня 2017-га.

*Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці*
■ Выстава **"Нясвіжскі праменад"** Ларысы Зарубінай — да 29 студзеня 2017-га.

*Ратуша*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Музейны праект **"Забытыя мелодыі"** — да 31 студзеня 2017-га.

### ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
*г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.*
■ Пастаянная экспазіцыя
■ Выстава **"На варце. 3 гісторыі формы СССР"** — да 15 студзеня 2017-га.

### ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
*г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.*

Экспазіцыя:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам, для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.

Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**.
■ Музейная творчая майстэрня.
■ **"Да Коласа на Новы год"** (святочная праграма для дзяцей).
■ Выстава мастацкіх работ Людмілы Пятруль да 90-годдзя зборніка алегарычных апавяданняў **"Казкі жыцця"** — да 20 студзеня 2017-га.

### ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
*г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.*

Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

Акцыі:
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"**.
■ **"Калядкі ў Купалавым доме"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў, іх бацькоў і настаўнікаў — да 31 студзеня 2017-га (акрамя суботы і нядзелі).

### МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
*г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.*

*Філіялы Музея гісторыі горада Мінска*

### ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
*г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.*

Экспазіцыя:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
■ Выстава **"ROBO ART"** — да 29 студзеня 2017-га.
■ Выстава **"Польшча. Архітэктура"** — да 15 студзеня 2017-га.

### МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
*г. Мінск, пл. Свабоды, 15. Тэл.: 321 24 30.*

Экспазіцыі:
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
■ Выстава **"Ад Лісабона праз Мінск да Уладзівастока"** — да 5 лютага 2017-га.

### МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
*г. Мінск, пл. Свабоды, 2а. Тэл.: 321 24 30.*

Экспазіцыі:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі"**.

### МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
*г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.*
■ Пастаянная экспазіцыя.

### ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
*г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10. Тэл.: 285 18 86.*

Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ Выстава **"Мастацкія палотны "Мінская палатно-Пакроў"** (мастацкія палотны, ручнікі, швейныя машыны).

### ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
*г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.*

Экспазіцыя:
■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж" (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

### АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"
*г. Мінск, вул. Герцэна, 2а. Тэл.: 321 24 30.*
■ Выстава фатаграфіі **"Дарогай майстра"** — да 8 студзеня 2017-га.

### АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ
*г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.*
■ Выстава **"Па слядах мамантаў"** — да 15 студзеня 2017-га.

### ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ
*г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.*

*Цэнтральная частка палаца*

Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня"**.
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея"**.

Выставы:
■ Выстава **"Прыстанак міласэрнасці. Мастацтва тыбецкага будызму"** са збору Дзяржаўнага Эрмітажа — да 22 студзеня 2017-га.
■ Персанальная фотавыстава Юрыя Бірукова **"Блаславёная зямля. Падарожжа па будысцкіх месцах"** — да 22 студзеня 2017-га.
■ Выстава **"Прыватная калекцыя"** Кацярыны Раджэсвенскай (Масква) — да 5 лютага 2017-га.
■ Выстава фотаздымкаў пачатку XX стагоддзя **"Сведкі палацавай эпохі"** — да 22 студзеня 2017-га.
■ Выстава **"Тры цвікі"** (у рамках праекта "Новае ў археалогіі Гомельшчыны").
■ Выстава **"Свет старажытных людзей"** — да 5 лютага 2017-га.

*Вежа палаца*

Экспазіцыя:
■ **"Уладальнікі Гомельскага палаца Румянцавы і Паскевічы"**.

Выставы:
■ Міні-выстава да 95-годдзя з дня нараджэння беларускага мастака Мікалая Палянкова.
■ Выстава **"Эпоха гігантаў: таямніца рэканструкцыі набярэжнай ракі Сож"** — да 31 снежня.
■ Выстава **"Норавы эпохі ў еўрапейскім рамане"** — да 31 снежня.

*Паўночнае крыло палаца*

Экспазіцыя:
■ **"Zooterra"**.

Выстава:
■ Выстава **экзатычных жывёл**.

*Зімовы сад*
■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл"**.

*Вежа агляду.*
*Спачывальня князёў Паскевічаў.*
■ Інтэрактыўны праект для школьнікаў **"Вялікі музей для цікаўных сяброў"**.

### ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ
*г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 57 41.*
■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"У баях за вызваленне"**.
■ Выстава **"Ваенна-гістарычная мініяцюра"**.

### ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
*г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 50 64.*

Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:
■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна…"**
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
■ Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**, прымеркаваная да 140-годдзя з дня нараджэння Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

### ІЎЕЎСКІ МУЗЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР
*г. Іўе, вул. 17 верасня, 9. Тэл. (8-01595) 2-68-96*
■ Экспазіцыя **"Пад адзіным небам праз стагоддзі"** ("Карэннае насельніцтва Іўеўшчыны", "Беларускія татары").
■ Выставы **"Беларускія яўрэі"**, **"Другая сусветная вайна"**.
■ Выстава габеленаў Марыі Старасцінай **"Натхненне"**.
■ Прадстаўленні лялечнага тэатра "Батлейка".

### ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ
*г. Навагрудак, вул. Леніна,1. Тэл.: (8-01597) 2-43-40 (каса)*
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.
■ Пастаянныя выставы: **"Свята кухні Міцкевічаў"**, **"Малюнкі сельскага жыцця"**, **"Пан Тадэвуш" праз час і народы"**.
■ Выстава **"Таямніцы майстэрства"** Навагрудскага раённага цэнтра рамёстваў.

## ГАЛЕРЭІ

### "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
*г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1. Тэл.: 327 26 12.*
■ Выстава **"Зачараванне вышытых карцін"** — да 12 студзеня 2017-га.
■ Выстава дыпломных работ студэнтаў завочнага аддзялення кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў — да 12 студзеня 2017-га.

## ТЭАТРЫ

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.*
■ **31 снежня — "Жар-птушка"** (балет у адной дзеі) І.Стравінскага. Пачатак аб 11-й.
■ **31 — Гала-канцэрт зорак Вялікага тэатра Беларусі.** Пачатак а 18-й.
■ **3 студзеня — "Іяланта"** (опера ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага.
■ **4 — "Доктар Айбаліт"** (опера ў 2-х дзеях) М.Марозавай. Пачатак а 12-й.
■ **4 — "Жызэль, або Вілісы"** (балет у 2-х дзеях) А.Адана.
■ **5 — "Тры парсючкі"** (балет у 2-х дзеях) С.Кібіравай. Пачатак а 12-й.
■ **5 — "Яўген Анегін"** (опера ў 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.
■ **6 — "Жар-птушка"** (балет у адной дзеі) І.Стравінскага. Пачатак а 12-й.
■ **6 — "Жар-птушка"** І.Стравінскага, **"Шапэніяна"** Ф.Шапэна, **"Балеро"** М.Равеля (балеты ў адной дзеі).

### БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР
*г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.*
■ **31 снежня — "Новы год у стылі Галівуд"** (музычнае шоў). Пачатак а 18-й.
■ **3 студзеня — "Бабін бунт"** (музычная камедыя ў 2-х дзеях) Я.Пціцкіна.
■ **4 — "Праўдзівая гісторыя паручніка Ржэўскага"** (гусарскі вадэвіль у 2-х дзеях) В.Баскіна.
■ **5 — "Блакітная камея"** (мюзікл у 2-х дзеях) К. Брэйтбурга.
■ **6 — "Юнона" і "Авось"** (рок-опера) А. Рыбнікава.

Спектаклі для дзяцей:
■ **3, 4, 6 студзеня** (пачатак аб 11-й і а 14-й) — **"Баль у Папялушкі"** (музычны шоу-канцэрт для дзяцей і дарослых у адной дзеі).
■ **5 — "Снежная каралева"** (мюзікл у 2-х дзеях) Г.Шайдулавай. Пачатак аб 11-й і а 14-й.

### ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
*г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.*
■ **3 студзеня — "Два чароўныя парасоны"** (казка для дзяцей і дарослых) Г.Х.Андэрсена. Пачатак аб 11-й.
■ **4 — "Гісторыя двух сабак"** (спектакль для дзяцей і дарослых) Я.Конева. Пачатак аб 11-й.
■ **4 — "Раскіданае гняздо"** (народная трагедыя) Янкі Купалы.
■ **5, 6 — "Залатое сэрцайка"** (інтэрактыўная казка для дзяцей і іх бацькоў) С.Навуменка. Пачатак аб 11-й і а 14-й.
■ **5 — "Нязваны госць"** (сямейная меладрама) С.Бартохавай.

### БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
*г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.*
■ **2, 3, 4 — "Прынцэса цырка і Дзед Мароз"** (танцавальна-забаўляльная праграма **"Новы год у краіне гномаў"** для дзяцей ад 3 гадоў). Пачатак а 17-й.